ВЫСТАВА

# Знаёмства з народным касцюмам



*Госці выставы з захапленнем разглядалі беларускія народныя строі*

**Кашуля, хвартух, андарак... Сёння назвы гэтых рэчаў многім невядомы, а раней яны складалі аснову народнага касцюма. Пабачыць аддзенне нашых продкаў у самабытным выкананні запрашае Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры. Да 20 сакавіка ва ўстанове працуе ўнікальная выстава «Скарбніца майстэрства».**

У экспазіцыі можна пабачыць рэканструкцыі і рэплікі старадаўніх народных строяў беларусаў, найбольш пашыраных на тэрыторыі Паазер'я. Увазе гледачоў таксама прадстаўлены саматканыя паясы, набойка па тканіне, вязаныя рэчы, ручнікі. Аўтарамі самаробных цудаў з'яўляюцца спецыялісты ЦРіТК Кацярына Папок, Галіна Акуцёнак, Наталля Карчова, Кацярына Усовіч. Аднак большая частка твораў належыць таленту майстра па вышыўке Кацярыне Васіленка. Над стварэннем адной кашулі яна працуе ад аднаго да трох месяцаў, дасканала вывучае значэнне і месца размяшчэння ўзора на тканіне. *«На маіх работах сімвалы ўрадлівасці, агню, сонейка, зоркі – усяго таго, што лічылася важным у паўсядзённым жыцці нашых продкаў. Прадстаўленыя тут касцюмы – святочныя. Гэта значыць, што апраналі іх пераважна ў царкву або на вяселле. За аснову вывучэння традыцыйнага строю я ўзяла канец 19 – пачатак 20 стагоддзя, таму што дадзены перыяд мае зафіксаваныя літаратурныя крыніцы. Адраджэнне народнага побытавага строю для сучасніка вельмі важна. Гэта як падарожжа ў мінулае – да нашых прабабуль, прадзядуль»,* – у размове з карэспандэнтам «НС» адзначыла Кацярына Юр'еўна.



*Майстар-клас па ткацтву ад Кацярыны Усовіч*



*Кацярына Васіленка з любімай работай*

Выстава выклікала сапраўдны ажыятаж. На адкрыццё сабралася шмат гасцей. Завітала і начальнік аддзела культуры гарвыканкама Алеся Садоўская. Кожны жадаючы мог паспрабаваць свае моцы за ткацкім станком і самаруч стварыць посцілку. Упрыгожваннем урачыстасці сталі аўтэнтычныя спевы народнага гурта «Княжыч» ЦРіТК і выступленне навучэнца БШ №10 Данііла Усовіча з вершам «Слуцкія ткачыхі».

Мерапрыемства наведалі кітайскія студэнты і магістранты з ПДУ, з якімі ЦРіТК усталяваў добрыя сяброўскія стасункі. Сваімі ўражанннямі ад ўбачанага жыхары Паднябеснай падзяліліся з карэспандэнтам «НС».

**Сунь ФЭНШО:**

*– Я навучаюся ў навапалацкім універсітэце на спецыяльнасці «Інавацыйныя тэхналогіі ў машына-будаўніцтве». У складзе групы пад кіраўніцтвам педагога-арганізатара па рабоце з замежнымі студэнтамі ПДУ Аленай Канавалавай мы не аднойчы бывалі ў цэнтры рамёстваў на разнастайных майстар-класах: шылі мяккія цацкі, навагоднія сувеніры, ляпілі керамічныя вырабы. Планую прывезці іх дадому ў якасці падарункаў родным. Па маіх назіраннях, беларусы добрыя, шчырыя, але сціплыя людзі. Гэтыя рысы характару можна заўважыць і ў вашым народным касцюме на выставе «Скарбніца майстэрства», якая мне вельмі спадабалася.*



**Чжан ЦЗЯМІН:**

*– Сённяшняя выстава значна пашырыла мае веды пра беларускую культуру. З'яўляючыся прадстаўніком мангольскай этнічнай групы ў Кітае, я заўважыў, што традыцыйныя касцюмы беларусаў маюць некаторыя падабенствы з нашымі. Думаю, нам ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго. Дзякуй за такую цудоўную экспазіцыю.*



**Нін СЯОСЯО:**

*– Родныя для мяне правінцыі Шаньдун і Цзіндэчжэнь здаўна славяцца стварэннем высокаякаснага керамічнага і фарфоравага посуда. Збіраючыся ў Наваполацк, я зацікавіўся беларускай культурай і быў ёй натуральна зачараваны. Выстава традыцыйнага народнага касцюма – цуд прыгажосці. Я вельмі рады таму, што прыехаў да вас вучыцца. Нафтаград прыгожы і ўтульны горад, дзе людзі жывуць камфортна і спакойна.*

